УДК 340. 115

*М. У. Сільчанка*

# СТРУКТУРНА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ АНАЛІЗ СІСТЭМЫ САЦЫЯЛЬНАГА РЭГУЛЯВАННЯ

Сістэма сацыяльнага рэгулявання – гэта арганічная полінарматыўная сістэма, якая з'яўляецца вынікам працяглай эвалюцыі сацыяльнага рэгулявання, складаецца з разнародных элементаў і структурна-функцыянальных сувязяў паміж імі. Аснову сучаснай сістэмы сацыяльнага рэгулявання складаюць тры тыпы сацыяльнага рэгулявання: прававы, маральна-рэлігійны і палітычны, кожны з якіх мае аднолькавы набор разнародных элементаў: 1) элемент генерацыі (узнаўлення і абнаўлення) – сацыяльная практыка; 2) мэтава-праграмны (ідэалагічны); 3) інфармацыйна-каштоўнасны; 4) нарматыўны элемент (нарматыўная сістэма); 5) элемент індывідуальнага рэгулявання; 6) элемент захавання і перадачы; 7) элемент кантролю і абароны. На перасячэнні і перакрыжаванні трох тыпаў і двух узроўняў сацыяльнага рэгулявання фарміруецца сістэма карпаратыўнага рэгулявання.

The system of social regulation – is the organic, poly regulatory system that is the result of a long evolution of social regulation, composed of heterogeneous elements and structural and functional connections between them. The basis of the modern system of social regulation consists of three types of social regulation – the legal, moral and religious, political, each of which has the same set of heterogeneous elements: 1) the element of generation (reproduction and updates) – a social practice; 2) targeted and software (ideological); 3) information and evaluative; 4) regulatory element (regulatory system); 5) the element of individual control; 6) the element of preservation and transmission; 7) the element of control and protection. At the intersection of the three types and two levels of social regulation, a system of corporate regulation is formed.

Ключавыя словы: элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання; мона- і полінарматыўная сістэма сацыяльнага рэгулявання; тыпы сацыяльнага рэгулявання; структурныя і функцыянальныя сувязі; узроўні сацыяльнага рэгулявання; карпаратыўнае рэгуляванне.

Keywords: elements of system of social regulation; mono- and polyregulatory system of social regulation; types of social regulation; structural and functional relations; levels of social regulation; corporate regulation

***Уводзіны.*** Асобная місія права ў жыцці грамадства высвятляецца шляхам параўнання яго сутнасці, форм існавання і рэгулятыўнага патэнцыялу з аналагічнымі параметрамі другіх сацыяльных рэгулятараў [1, с. 7–11; 2, с. 18; 3, с. 100–145]. Пры гэтым у сферы параўнальна-прававога аналізу традыцыйна знаходзяцца мараль і звычаі, традыцыі і рэлігійныя нормы, карпаратыўныя

і тэхнічныя нормы, нарматыўныя і індывідуальныя рэгулятары. Разам з тым адны аўтары выдзяляюць палітычныя нормы ў якасці самастойнага віду сацыяльных рэгулятараў, другія – абвяргаюць наяўнасць такога віду сацыяльных норм; адны даследчыкі лічаць асобным сацыяльным рэгулятарам традыцыі, а другія – звычаі; адны вучоныя ўключаюць індывідуальныя сродкі ўздзеяння ў склад інструментаў сацыяльнага рэгулявання, а другія – зводзяць сістэму сацыяльнага рэгулявання да сукупнасці нарматыўных рэгулятараў. Невыпадкова ў вучэбнай юрыдычнай літаратуры працэс сацыяльнага рэгулявання абазначаецца рознымі па аб'ёме паняццямі: 1) «сістэма сацыяльных норм» [4, с. 196–214; 5, с. 139–150; 6, с. 285–312]; 2) «сістэма нарматыўнага рэгулявання» [7, с. 276–298; 8, с. 86–103]; 3) «сістэма рэгулявання грамадскіх адносін» [9, с. 196–209; 10, с. 197–207]; 4) «сістэма сацыяльных рэгулятараў» [11, с. 338–362; 12, с. 176–196]; 5) «сістэма сацыяльнага рэгулявання» [13, с. 398–407; 14, с. 243–256] і г. д.

Бачна, што патрабуецца адпаведны прыродзе сацыяльнага рэгулявання метадалагічны падыход, які дазволіць удакладніць змест паняцця сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Дзеля гэтага неабходна: 1) вызначыць элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання; 2) разгледзець генезіс сістэмы сацыяльнага рэгулявання; 3) акрэсліць асноўныя структурныя і функцыянальныя сувязі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання.

***Паняцце і элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання.*** Найбольш прыдатнымі для абазначэння працэсаў сацыяльнага рэгулявання з'яўляюцца тоесныя па аб'ёме, але розныя па функцыянальным прызначэнні паняцці «сістэма сацыяльных рэгулятараў» і «сістэма сацыяльнага рэгулявання», таму што яны ахопліваюць максімальную колькасць разнародных сродкаў ажыццяўлення сацыяльнага рэгулявання і дазваляюць ахарактарызаваць як статычныя, так і дынамічныя аспекты сацыяльнага рэгулявання. У самым агульным плане сістэма сацыяльнага рэгулявання – гэта арганічная сацыяльная сістэма, якая ўключае сукупнасць *разнародных* элементаў, з дапамогай якіх ажыццяўляецца ўздзеянне на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін. Паколькі сістэма сацыяльнага рэгулявання з'яўляецца арганічнай сістэмай, то яе «...элемент не может быть описан вне его функциональных характеристик, с точки зрения системы важно в первую очередь не то, каков субстрат элемента, а то, что делает, чему служит элемент в рамках целого. В системе, представляющей собой органичное целое, элемент и определяется прежде всего по его функции: как минимальная единица, способная к относительно самостоятельному осуществлению определенной функции» [15, с. 185].

Прафесар А. Б. Венгераў выдзяляе ў сістэме сацыяльнага рэгулявання дзве групы рэгулятараў: нарматыўныя і ненарматыўныя. У склад нарматыўных

рэгулятараў аўтар уключае прававы, маральны, групавы (карпаратыўныя нормы арганізацый і аб'яднанняў), юрыдыка-тэхнічны, звычай і іншыя, а да ненарматыўных адносіць каштоўнасны, дырэктыўны, інфармацыйны рэгулятары, сацыяльны інстытут прадбачання і інш. [11, с. 345]. Як відаць, сістэма сацыяльнага рэгулявання не зводзіцца да сістэмы нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін і высвятлення месца ў гэтай сістэме норм права. Сістэма нарматыўнага рэгулявання грамадскіх адносін – важная, але ўсё ж толькі адна з састаўных частак сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Мы падзяляем метадалагічны падыход А. Б. Венгерава, але, на наш погляд, каштоўнасны, інфармацыйны і дырэктыўны рэгулятары, а таксама інстытут сацыяльнага прадбачання можна ўявіць у якасці двух адносна самастойных элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання: мэтава-праграмнага (ідэалагічнага) і інфармацыйна-каштоўнаснага. Пры гэтым дырэктыўныя сродкі, як і сацыяльны інстытут прадбачання, уваходзяць у склад мэтава-праграмнага элемента сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Сучасная сістэма сацыяльнага рэгулявання складаецца з наступных элементаў: 1) элемент генерацыі (узнаўлення і абнаўлення) сістэмы сацыяльнага рэгулявання – сацыяльная практыка; 2) мэтава-праграмны (ідэалагічны); 3) інфармацыйна-каштоўнасны; 4) нарматыўны (нарматыўная сістэма); 5) элемент індывідуальнага рэгулявання грамадскіх адносін; 6) элемент захавання і перадачы сістэмы сацыяльнага рэгулявання; 7) элемент абароны і кантролю сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Асноўныя задачы, якія вырашае сістэма сацыяльнага рэгулявання, – забеспячэнне парадку ў грамадскіх адносінах і стварэнне неабходных умоў (гарантый) для развіцця сацыяльнай супольнасці. Кожны з элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання вырашае свае адметныя задачы, але разам з тым развіццё і функцыянаванне кожнага з іх падпарадкаваны задачам, якія вырашае сістэма сацыяльнага рэгулявання цалкам. Іншая справа, што кожны з элементаў сістэмы забяспечвае вырашэнне агульнасістэмных задач сваімі ўласнымі механізмамі, метадамі і сродкамі, якія адпавядаюць яго прыродзе. У права адны механізмы, метады і сродкі, а ў маралі – другія. Асобныя элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання выкарыстоўваюць рэсурсы адзін аднаго пры вырашэнні агульнасістэмных задач. Так, права можа выкарыстоўваць маральныя рэсурсы, а рэсурсы, якія ўласцівы праву, пры пэўных абставінах выкарыстоўваюцца для забеспячэння дзеяння маралі.

У падмурку сістэмы сацыяльнага рэгулявання знаходзіцца *элемент генерацыі* (*узнаўленне і абнаўленне*), ролю якога выконвае сацыяльная практыка ў самым шырокім сэнсе слова. Сацыяльная практыка – аснова ўзнікнення, пастаяннага ўзнаўлення і абнаўлення сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

На практыцы правяраецца эфектыўнасць існуючай сістэмы сацыяльнага рэгулявання і вызначаецца неабходнасць яе абнаўлення цалкам ці яе асобных элементаў. Пасля істотных зрухаў менавіта ў элеменце генерацыі адбываюцца якасныя перамены ў сістэме сацыяльнага рэгулявання цалкам. Так, у Расіі пасля сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 г. карэнным чынам памянялася сацыяльная практыка, адбыліся істотныя перамены ў мэтава-праграмным і інфармацыйна-каштоўнасным элементах сістэмы сацыяльнага рэгулявання, іншым стаў нарматыўны элемент сістэмы, памяняліся індывідуальныя сродкі сацыяльнага рэгулявання, іншымі па змесце і форме сталі элемент захавання і перадачы сацыяльнага вопыту і элемент кантролю і абароны сістэмы. Прыкладна такія ж зрухі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання адбываліся ў 1990-х гг. пасля разбурэння сацыялістычнага грамадства і адэкватнай яму сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Ад сацыяльнай практыкі падаюцца сігналы ў мэтава-праграмны элемент аб неабходнасці *карэкцыі* мэт і задач сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Вузлавым у сістэме сацыяльнага рэгулявання з'яўляецца *мэтава-праграмны элемент*, які «аб'ядноўвае» разнародныя сродкі сацыяльнага рэгулявання ў адзінае цэлае, у сістэму сацыяльнага рэгулявання, забяспечвае функцыянальнае адзінства сістэмы і надае ёй мэтанакіраванасць. Мэтанакіраванасць сістэмы сацыяльнага рэгулявання першапачаткова забяспечвалі рэлігійныя культы, затым – сусветныя рэлігійныя сістэмы, у большасці сучасных дзяржаў за фармуляванне мэт сістэмы сацыяльнага рэгулявання адказвае свецкая ідэалогія, а ў тэакратычных дзяржавах прыярытэт па-ранейшаму застаецца за рэлігіяй. Свецкая ідэалогія і рэлігія акрэсліваюць асноўныя вектары руху і функцыянавання сістэмы сацыяльнага рэгулявання, выдаюць своеасаблівыя «загады і распараджэнні» ўсім астатнім элементам сістэмы. Разам з тым усе элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання маюць зваротныя сувязі з мэтава-праграмным элементам і аказваюць уздзеянне на яго.

Пры характарыстыцы мэтава-праграмнага элемента ўзнікае пытанне аб месцы і ролі навукі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання, таму што «научное знание есть единственная форма духовной культуры, общая для всего человечества, не зависящая в своей основе от исторического или географического места и времени. Только наука и тесно связанная с нею техника вызывают единство культуры для всего человечества, достигают того, к чему напрасно стремились различные формы религии и школы философии. Это является неизбежным следствием самой сущности науки – единой, в основе своих выводов для всех обязательной и непререкаемой» [16, с. 247–248]. Разам з тым навука не ўваходзіць у склад мэтава-праграмнага элемента сістэмы сацыяльнага рэгулявання, і яе нельга паставіць поруч з ідэалогіяй і рэлігіяй, таму што яна не можа самастойна вызначаць мэты развіцця грамадства і яго

сістэмы сацыяльнага рэгулявання. У навукі іншая місія, яна «занимается построением моделей действительности, той действительности, которая есть на самом деле, а не той, которая должна быть. Она отвечает на вопросы: “Что есть на самом деле?”, “Что будет, если сделать то-то и то-то?”. Но просто на вопрос “Что надо сделать?” без всяких “если” и “чтобы” она ответить принципиально не может. <...> Проблема Высшей Цели остается вне науки, и ее решение необходимо требует волевого акта, оно является в конечном счете результатом свободного выбора» [17, с. 333–334].

Навука адказвае за фармуляванне заканамернасцей развіцця грамадства, прыроды і мыслення, якія звычайна знаходзяцца ў падмурку ідэалогіі, але разам з тым ідэалогія ўтрымлівае погляды і ідэі, якія маюць вузкагрупавы, аднабокі характар, і таму ідэалогія можа быць навуковай і ненавуковай. Больш складанымі з’яўляюцца адносіны паміж навукай і рэлігіяй. Распаўсюджана думка аб тым, што гэтыя сістэмы несумяшчальныя і што рэлігія не мае навуковага характару. На наш погляд, гэта не так. Больш пераканальнымі з’яўляюцца іншыя высновы. «После почти двухвековой страстной борьбы, – піша французскі вучоны П’ер Тэяр дэ Шардэн, – ни наука, ни вера не сумели ослабить одна другую. Но совсем даже напротив становится очевидным, что они не могут развиваться нормально одна от другой по той простой причине, что обе одушевлены одной и той же жизнью. В самом деле, ни в своем порыве, ни в своих истолкованиях наука не может выйти за пределы самой себя, не окрашиваясь мистикой и не заряжаясь верой. Религия и наука – две неразрывно связанные стороны, или фазы одного и того же полного акта познания, который только один смог бы охватить прошлое и будущее эволюций, чтобы их рассмотреть, измерить и завершить. Во взаимном усилении этих двух все еще антагонистических сил, в соединении разума и мистики человеческому духу самой природой его развития предназначено найти высшую степень своей проницательности вместе с максимумом своей жизненной силы» [18, с. 222–223].

Прыкладна такая ж выснова была зроблена прафесарам, доктарам тэхнічных навук, членам-карэспандэнтам НАН Беларусі В. І. Вейнікам, які лічыць, што «...истинная Религия и истинная Наука – это два русла, закономерно ведущие к познанию и прославлению Творца. Религия имеет дело с *духовным* миром и *Верой.* <...> Наука имеет дело с *телесным* миром и *знанием.* Суть истинного знания выражена набором соответствующих физических представлений, правил и законов, то есть *парадигмой* <...> которая устанавливается людьми, поэтому не абсолютно верна и изменяется со временем <...> в науке и религии, в телесном и духовном мирах, которые различаются между собой принципиально, как земля и небо, действуют столь же принципиально различающиеся *законы*: в первом – физические

закономерности, вытекающие из парадигмы, а во втором – *промысел Божий*, пути которого неисповедимы. Поэтому наука никак не может противоречить религии, но, наоборот, она призвана гармонично дополнять ее» [19, с. 34–37].

Такім чынам, навука займае асобнае месца ў сістэме сацыяльнага рэгулявання, яна знаходзіцца на мяжы мэтава-праграмнага і інфармацыйна-каштоўнаснага элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Навуковыя даныя дапаўняюць мэтава-праграмны элемент сістэмы сацыяльнага рэгулявання, узмацняюць яго, але разам з іншымі звесткамі аб рэгулюемых грамадскіх адносінах даныя навукі ўключаюцца ў інфармацыйна-каштоўнасны блок сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Навука з'яўляецца своеасаблівым мастком паміж мэтава-праграмным і інфармацыйна-каштоўнасным элементамі сістэмы сацыяльнага рэгулявання, звязвае гэтыя элементы паміж сабой, а таксама забяспечвае сувязь мэтава-праграмнага блока з астатнімі элементамі сістэмы сацыяльнага рэгулявання і элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання паміж сабой.

Асноўная функцыя *інфармацыйна-каштоўнаснага элемента* – забеспячэнне сістэмы сацыяльнага рэгулявання належнай інфармацыяй, «адсарбіраванне» карысных для развіцця асобы, дзяржавы і грамадства ідэй, тэорый і каштоўнасцей з тым, каб яны былі найперш замацаваны ў нарматыўным элеменце сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Інфармацыйна-каштоўнасны элемент сістэмы сацыяльнага рэгулявання адказвае за ацэнку навуковых даных і іншых звестак, у тым ліку існуючых і ствараемых норм і індывідуальных сродкаў сацыяльнага рэгулявання на прадмет іх адпаведнасці мэтам і задачам сістэмы сацыяльнага рэгулявання, і выконвае ў сацыяльнай сістэме функцыю «сацыяльнага фільтра». У гэтым плане інфармацыйна-каштоўнасны элемент падпарадкаваны мэтава-праграмнаму блоку. Але ў той жа самы час інфармацыйна-каштоўнасны элемент аказвае зваротнае ўздзеянне на мэтава-праграмны, таму што ўзважвае мэты і задачы развіцця сістэмы сацыяльнага рэгулявання на прадмет адпаведнасці сучасным навуковым даным, базавым каштоўнасцям асобы, грамадства і дзяржавы.

Асноўная частка сістэмы сацыяльнага рэгулявання грамадскіх адносін складваецца *з нарматыўнага элемента* (*нарматыўнай сістэмы*) *і элемента індывідуальнага рэгулявання* грамадскіх адносін. Нарматыўны элемент – гэта разнастайныя па змесце і форме існавання правілы паводзін агульнага характару (сацыяльныя нормы): нормы першабытнага грамадства, прававыя, маральныя, палітычныя, карпаратыўныя і г. д. Элемент індывідуальнага рэгулявання – разавыя патрабаванні і распараджэнні індывідаў, сацыяльных груп, органаў і ўстаноў грамадства і дзяржавы, з дапамогай якіх рэалізуюцца правілы паводзін агульнага характару і ўладкоўваецца канкрэтная жыццёвая сітуацыя, а таксама разавыя патрабаванні і распараджэнні, якія «не завязваюцца» на

правілы паводзін агульнага характару і дзейнічаюць адносна аўтаномна. Да індывідуальных сродкаў сацыяльнага рэгулявання, праз якія ажыццяўляюцца сувязі паміж усімі элементамі сістэмы сацыяльнага рэгулявання, адносіцца грамадская думка (грамадскае меркаванне).

Нарматыўны элемент сацыяльнага рэгулявання разам з элементам індывідуальнага рэгулявання складаюць «інструментальны блок» рэгулявання грамадскіх адносін. Два гэтыя элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання разам з залежнасцямі паміж імі і сувязямі ўнутры кожнага з элементаў складаюць аснову сістэмы сацыяльнага рэгулявання, альбо сістэму сацыяльнага рэгулявання ў *вузкім сэнсе слова.* Нарматыўныя і індывідуальныя рэгулятары акрэсліваюць знешнія межы сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Там, дзе няма сацыяльнай нормы і адпаведнага ёй зместу і характару індывідуальнага рэгулятара, не існуе і сацыяльнага рэгулявання. Нарматыўныя і індывідуальныя рэгулятары прысутнічаюць у кожным элеменце сістэмы сацыяльнага рэгулявання, але яны замацоўваюцца ў адпаведных прыродзе элемента формах і сацыяльных механізмах, напрыклад у форме рэлігіі ці традыцыі, каштоўнасці ці асобнай працэдуры і г. д. Калі мэтава-праграмны элемент забяспечвае адзінства сістэмы сацыяльнага рэгулявання «па вертыкалі», то «інструментальны блок» аб’ядноўвае сістэму сацыяльнага рэгулявання «па гарызанталі», ён цэментуе разнародныя сродкі сацыяльнага рэгулявання.

*Элемент захавання і перадачы сістэмы сацыяльнага рэгулявання.* Адна з важных функцый сістэмы сацыяльнага рэгулявання – замацаванне накопленага сацыяльнага вопыту, усяго комплексу культурных дасягненняў, сацыяльных каштоўнасцей і перадача іх наступным пакаленням. Ажыццяўляецца яна праз разнастайныя абрады, рытуалы, цырымоніі (усе яны з’яўляюцца разнавіднасцямі традыцый), а таксама праз формы перадачы сацыяльнага вопыту – ініцыяцыі (выпрабаванні) у першабытным грамадстве, выхаванне, асвету і адукацыю ў сучасным свеце, якія скіраваны на сацыялізацыю асобы, на інтэрыярызацыю каштоўнасцей, імператываў і норм.

*Элемент кантролю і абароны сістэмы сацыяльнага рэгулявання.* Сістэма сацыяльнага рэгулявання не можа існаваць і выконваць сваё прызначэнне без кантролю за належным функцыянаваннем усіх элементаў, без іх абароны і ўсёй сістэмы цалкам ад непажаданых узрушэнняў. Механізмы, формы і метады кантролю і абароны вызначаюцца ўзроўнем развіцця сацыяльнага рэгулявання. У склад гэтага элемента ўваходзяць разнастайныя механізмы, працэдуры і працэсуальныя нормы, з дапамогай якіх асоба, калектыў, арганізацыйныя структуры грамадзянскай супольнасці, органы і ўстановы дзяржавы ажыццяўляюць кантроль за сістэмай сацыяльнага рэгулявання і яе абарону ад знешніх узрушэнняў. Праз кантрольныя механізмы ўсе элементы

сістэмы сацыяльнага рэгулявання звязваюцца паміж сабой і ажыццяўляецца іх зваротнае ўздзеянне на мэтава-праграмны элемент. Без належнай абароны сістэма сацыяльнага рэгулявання можа быць лёгка разбурана.

Падкрэслім, што ў склад *элемента кантролю і абароны сістэмы сацыяльнага рэгулявання*, як, дарэчы, і разгледжаных вышэй элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання, не ўваходзяць структуры грамадзянскай супольнасці, органы і ўстановы дзяржавы. У змест элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання ўключаюцца толькі нарматыўна замацаваныя і звычаёвыя формы і сацыяльныя механізмы, працэдуры і працэсуальныя нормы, праз якія і з дапамогай якіх ажыццяўляецца сувязь грамадства і дзяржавы з сістэмай сацыяльнага рэгулявання і з кожным з яе элементаў.

***Узнікненне і этапы развіцця сістэмы сацыяльнага рэгулявання.*** Сістэма сацыяльнага рэгулявання пачала складвацца адначасова з фарміраваннем грамадства і заўсёды была істотным фактарам яго самазахавання і развіцця. Момант узнікнення сістэмы сацыяльнага рэгулявання можна звязваць з фарміраваннем самых першых заканамернасцей паміж індывідуальнымі і нарматыўнымі рэгулятарамі, таму што любая сацыяльная сістэма – гэта найперш элементы, «объединенные *разнообразными связями и взаимоотношениями*, специфически социальными по своей природе» (курсіў мой. – *М. С.*) [20, с. 611].

Гістарычна першымі сродкамі ўздзеяння на паводзіны людзей былі індывідуальныя рэгулятары – яны забяспечвалі арганізацыю сумесных дзеянняў людзей пры вырашэнні канкрэтных задач і гублялі сваё значэнне пасля таго, як праводзіліся ў жыццё. Калі чалавек атрымаў магчымасць рабіць абагульненні, з’явіліся правілы паводзін агульнага характару – нарматыўныя рэгулятары, і адначасова паміж індывідуальнымі і нарматыўнымі сродкамі рэгулявання грамадскіх адносін сфарміраваліся першыя залежнасці – самастойныя заканамернасці сацыяльнага рэгулявання: аднародныя індывідуальныя рэгулятары пасля абагульнення ўласцівых ім тыповых якасцей трансфарміруюцца ў правілы паводзін агульнага характару, а для рэалізацыі правіл паводзін агульнага характару патрабуюцца індывідуальныя рэгулятары.

Сістэма сацыяльнага рэгулявання ў сваім развіцці прайшла два асноўныя перыяды: перыяд, калі яна існавала ва ўмовах прысвойваючай эканомікі, і перыяд, калі развівалася на этапе вытворчай эканомікі. Сістэма сацыяльнага рэгулявання ва ўмовах прысвойваючай эканомікі таксама прайшла некалькі этапаў развіцця, якія можна выдзеліць у сувязі з фарміраваннем якасна новых відаў нарматыўных рэгулятараў: тэхнічны (*норма-стандарт*), табуіраваны (*табу*) і міфалагічны (*міф*). З’яўленне кожнага з адзначаных відаў правіл паводзін суправаджалася пераменамі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання цалкам.

Самыя першыя сацыяльныя нормы былі *фактычнымі «нормамі-стандартамі»*, у іх змесце адсутнічаў элемент, які сёння называецца «норма-патрабаванне», не існавала ў гэтым правіле паводзін і санкцыі – часткі нормы, у якой прадугледжваліся меры ўздзеяння (рэакцыі) з боку супольнасці і дзяржавы на асобу за парушэнне «нормы-стандарту». Ролю санкцый у той час выконвалі негатыўныя для чалавека наступствы прыроднага характару, якія непазбежна наступалі ў выпадку парушэння «нормы-стандарту», а таксама меры ўздзеяння з боку супольнасці. Можна выказаць меркаванне, што найбольшая колькасць сацыяльных норм на першых этапах развіцця першабытнага грамадства мела *тэхнічны характар* і ўяўляла пэўныя «тэхнічныя стандарты», якія чалавек выпрацоўваў у ходзе эксплуатацыі навакольнага асяроддзя падчас сумеснай працоўнай дзейнасці. Таму дадзены этап у развіцці сістэмы сацыяльнага рэгулявання і абазначаецца як *тэхнічны.* На ранніх этапах сацыяльнага рэгулявання сфарміраваліся і самыя першыя каштоўнасці, у якасці якіх выступалі якраз «нормы-стандарты». Менавіта таму, што гэтыя нормы ўяўлялі агульныя каштоўнасці для першабытных людзей, яны абараняліся і захоўваліся грамадскай думкай, агульнай воляй людзей і індывідуальнымі сродкамі фізічнага ўздзеяння на асобу з боку супольнасці.

Такім чынам, першасная сістэма сацыяльнага рэгулявання, якая сфарміравалася на ранніх этапах прысвойваючай эканомікі першабытнага грамадства, была аднаўзроўневай і ўключала наступныя элементы: 1) элемент генерацыі сістэмы сацыяльнага рэгулявання – сацыяльную практыку; 2) нарматыўны элемент – «нормы-стандарты»; 3) індывідуальныя рэгулятары; 4) каштоўнасны элемент; 5) элемент абароны сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Перамены ў сістэме сацыяльнага рэгулявання адбыліся пасля таго, як у грамадстве сфарміраваліся новыя правілы паводзін – **табу** (абсалютныя забароны). У сувязі з гэтым узнікае пытанне аб суадносінах «правіл-стандартаў» і табу. Можна выказаць меркаванне, што табу былі першымі *сацыяльнымі* нормамі, якія сфарміраваліся ў той сферы жыцця грамадства, што раней рэгулявалася індывідуальнымі прадпісаннямі, і самымі першымі «нормамі-патрабаваннямі». У гэтых адносінах табу нагадваюць сацыяльныя нарматыўныя рэгулятары ў сучасным сэнсе слова [21, с. 47–50]. Магчыма, асобныя табу выцякалі з вопыту рэалізацыі канкрэтных «правіл-стандартаў», былі скіраваны на іх абарону, але былі і такія табу, якія выцякалі з сацыяльнага вопыту ўвогуле. Табу дапаўнялі дзеючыя «нормы-стандарты», але не з’яўляліся элементам «правіла-стандарту» і не маглі быць яго санкцыяй у сучасным сэнсе слова. «Нормы-стандарты» адносіліся да сутнаснага, да рэальнага жыцця, а табу – да таго, як павінна быць, да «патрабавання».

Такім чынам, на сёння мы не можам канстатаваць, што паміж «нормай-сутнасным» і «нормай-патрабаваннем» існавала арганічнае адзінства, якое

характэрна для асобных частак аднаго правіла паводзін. Але разам з тым мы можам адзначыць, што з узнікненнем табу значна пашырылася поле менавіта сацыяльнага рэгулявання і пачаўся новы этап у развіцці сістэмы сацыяльнага рэгулявання, для якога характэрна ўзнікненне яшчэ аднаго элемента сістэмы сацыяльнага рэгулявання – элемента захавання і перадачы сацыяльнага вопыту наступным пакаленням – рытуалаў, абрадаў і цырымоній – складаных сацыяльных утварэнняў, якія з'яўляюцца адначасова як формамі замацавання і перадачы сацыяльнага вопыту, так і асобнымі працэсуальнымі правіламі паводзін. Рэалізацыя табу адбывалася праз асобныя індывідуальныя прадпісанні, і таму з узнікненнем дадзенага правіла паводзін складваецца яшчэ адзін від устойлівых сувязяў паміж элементамі сістэмы сацыяльнага рэгулявання: кожны від нарматыўнага рэгулявання патрабуе адпаведнай сістэмы індывідуальных сродкаў сацыяльнага рэгулявання, а перамены ў нарматыўным элеменце сацыяльнай рэгуляцыі абумоўліваюць з'яўленне новых відаў індывідуальных сродкаў рэгулявання.

Пасля з'яўлення міфа пачынаецца яшчэ адзін этап у развіцці сістэмы сацыяльнага рэгулявання, на якім узнікае новы від сацыяльных сувязяў паміж нарматыўнымі рэгулятарамі табу і міфам. Міф вылучаецца на першае па значнасці месца і пачынае выконваць роль *мэтава-праграмнага элемента сістэмы сацыяльнага рэгулявання.* Табу па-ранейшаму рэгламентуюць сацыяльныя сувязі, але яны падпарадкоўваюцца міфу, у грамадстве падтрымліваюцца, абараняюцца і захоўваюцца табу, якія не парушаюць міфалогію старажытнага грамадства. Адметная асаблівасць міфа ў тым, што ён утрымлівае не толькі забароны, але і станоўчыя ўзоры паводзін, на якія павінны арыентавацца ўдзельнікі грамадскіх адносін. Мы заўважаем у міфе, па-першае, спалучэнне «нормы-сутнаснага» і «нормы-патрабавання» і, па-другое, станоўчую ці адмоўную санкцыю. Праўда, у міфе сацыяльная норма яшчэ не існуе ў фармалізаваным выглядзе – яна выкладаецца ў форме прыкладу паводзін і пэўнага маральнага вываду. З узнікненнем міфа адбываюцца перамены ў элеменце захавання і перадачы сацыяльнага вопыту. Мяняецца змест каштоўнаснага элемента, адбываецца падзел каштоўнасцей на карысныя і шкодныя, узрастае аб'ём інфармацыйнай часткі дадзенага элемента. Адначасова ў сістэме сацыяльнага рэгулявання набывае завершаны выгляд элемент кантролю і абароны. У грамадстве фарміруецца асобны сацыяльны інстытут шаманства, які ажыццяўляе абарону сістэмы сацыяльнага рэгулявання і кантроль за яе захаваннем.

Такім чынам, на этапе прысвойваючай эканомікі сістэма сацыяльнага рэгулявання набыла завершаны выгляд. Мы можам адзначыць набор усіх элементаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання, наяўнасць структурных і функцыянальных сувязяў паміж асобнымі элементамі сістэмы.

З зараджэннем вытворчай эканомікі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання з'яўляецца новы від правіл паводзін – *каляндар* – звод правіл паводзін першабытных земляробаў і жывёлаводаў, у сувязі з чым у развіцці сістэмы сацыяльнага рэгулявання адбываецца *метасістэмны пераход*, які «создает высший уровень организации – метауровень по отношению к уровню организации интегрируемых подсистем» [17, с. 76]. Сістэма сацыяльнага рэгулявання, якая сфарміравалася раней, захоўваецца, яна па-ранейшаму рэгламентуе частку грамадскіх адносін, але адначасова ўваходзіць у склад новай сістэмы, трапляе ў сілавое поле больш складанай сістэмы і ў адпаведнасці з агульнымі сістэмнымі заканамернасцямі вымушана падпарадкоўвацца прынцыпам, на аснове якіх функцыянуе сістэма больш высокага ўзроўню. Паміж сістэмай сацыяльнага рэгулявання, заснаванай на календары, і сістэмай, у падмурку якой ляжалі табу і міфы, складваюцца новыя структурныя і функцыянальныя залежнасці.

У новай сістэме мы назіраем перамены ў элеменце генерацыі. Сацыяльная практыка ў дадзенай сістэме сацыяльнага рэгулявання – гэта вытворчая і сацыяльная дзейнасць першабытных абшчын земляробаў і жывёлаводаў, якія ажыццяўляюць актыўнае ўмяшальніцтва ў навакольнае асяроддзе, займаюцца развядзеннем жывёлы і селекцыяй раслін, што патрабуе дакладных ведаў аб харчаванні і размнажэнні жывёлы, астранамічных ведаў аб вегетацыі раслін і г. д. У параўнанні з сацыяльнай практыкай рыбаловаў, паляўнічых і збіральнікаў грамадскія адносіны ў першабытных абшчынах земляробаў і жывёлаводаў з'яўляюцца больш складанымі, для іх рэгулявання патрабуецца сістэма больш дасканалых правіл паводзін, якія адпавядаюць прыродзе і характару працы земляробаў і жывёлаводаў, дакладна і падрабязна рэгламентуюць дзеянні людзей.

Адбываюцца істотныя перамены ў нарматыўным элеменце сістэмы сацыяльнага рэгулявання, сацыяльная норма ў календарах набывае класічны (*фармалізаваны*) *выгляд. У нормах календара дакладна выдзяляецца само правіла паводзін, умова, калі павінна выконвацца правіла паводзін, і санкцыя за невыкананне правіла. У адпаведнасці са зместам новага нарматыўнага элемента сістэмы сацыяльнага рэгулявання фарміруецца элемент індывідуальнага рэгулявання.* У сістэме сацыяльнага рэгулявання, заснаванай на календары, з'яўляецца свой мэтава-праграмны блок, у якасці якога выступаюць старажытныя рэлігійныя культы, напрыклад культ сонца, луны і г. д. Інфармацыйна-каштоўнасны элемент гэтай сістэмы ў параўнанні з аналагічным элементам сістэмы ва ўмовах прысвойваючай эканомікі напаўняецца іншым зместам – астранамічнай, кліматычнай, біялагічнай і іншай прыродазнаўчай інфармацыяй, іншымі, у параўнанні з папярэдняй сістэмай, з'яўляюцца і каштоўнасці. Мяняецца змест элемента захавання і перадачы сацыяльнага вопыту, а таксама элемента кантролю і абароны сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Падкрэслім, што ва ўмовах прысвойваючай эканомікі і на першых этапах вытворчай эканомікі, калі існавала сацыяльна аднароднае грамадства, дзейнічала *мананарматыўная сістэма* сацыяльнага рэгулявання, якая была маналітнай, мела адзіны ўніверсальны тып сацыяльнага рэгулявання, адзін узровень захавання і развіцця – самарэгуляванне, у той сістэме існавалі адметныя структурныя і функцыянальныя сувязі [22, с. 27–28], сацыяльная норма – аснова сацыяльнага нарматыўнага рэгулявання – набыла завершаны ў структурных адносінах фармальна азначаны выгляд.

У сацыяльна неаднародным грамадстве, якое сфарміравалася ў ходзе і ў выніку неалітычнай рэвалюцыі, узнікла новая сістэма сацыяльнага рэгулявання – *палінарматыўная сістэма*, у падмурку якой знаходзяцца тры якасна новыя ўніверсальныя сацыяльныя рэгулятары – права, мараль, палітыка. Адносна *палінарматыўнай* сістэмы сацыяльнага рэгулявання мы не можам выкарыстоўваць паняцце метасістэмнага пераходу, таму што ранейшая сістэма сацыяльнага рэгулявання, у падмурку якой знаходзіўся каляндар, была цалкам разбурана.

Адбыліся істотныя перамены ў элеменце генерацыі сістэмы сацыяльнага рэгулявання. У кожнага з новых сацыяльных рэгулятараў сфарміраваўся свой адметны элемент генерацыі (аднаўлення і абнаўлення), у якасці якога выступаюць розныя па змесце і характары віды сацыяльнай дзейнасці і грамадскія адносіны, існуе свой самастойны від сацыяльнай практыкі. У кожнага з сацыяльных рэгулятараў маюцца адпаведны яго зместу мэтава-праграмны і інфармацыйна каштоўнасны элемент, самастойныя сродкі індывідуальнага рэгулявання – прававыя, маральныя (рэлігійныя) і палітычныя індывідуальныя патрабаванні. У кожнага з якасна новых універсальных сацыяльных рэгулятараў з'явіліся адпаведныя іх зместу формы захавання і перадачы сацыяльнага вопыту – прававыя, маральныя (рэлігійныя) і палітычныя традыцыі. Істотныя перамены адбыліся ў элементах кантролю і абароны сістэмы сацыяльнага рэгулявання. У сферы дзеяння кожнага ўніверсальнага сацыяльнага рэгулявання сфарміраваліся адпаведныя механізмы кантролю і абароны, спецыфічныя працэсуальныя і працэдурныя правілы і сродкі. Важна падкрэсліць, што ў палінарматыўнай сістэме сацыяльнага рэгулявання не проста з'явіліся якасна новыя працэдурныя і працэсуальныя правілы і сродкі, але і атрымалі вельмі моцны штуршок для свайго развіцця.

***Тыпы, віды і ўзроўні сістэмы сацыяльнага рэгулявання.*** На падставе новых універсальных сацыяльных рэгулятараў: права, маралі, палітыкі – у сістэме сацыяльнага рэгулявання сфарміраваліся тры буйныя комплексы, тры асобныя тыпы сацыяльнага рэгулявання: прававы, маральна-рэлігійны і палітычны, якія маюць у сваім складзе ўсе адзначаныя вышэй элементы сістэмы сацыяльнага рэгулявання.

Тыпы сацыяльнага рэгулявання функцыянуюць у сістэме сацыяльнага рэгулявання адначасова, але адзін з іх займае дамінуючае становішча і вяршэнствуе. У залежнасці ад таго, які з тыпаў знаходзіцца на вяршыні сістэмы сацыяльнага рэгулявання, можна выдзеліць тры віды сістэм сацыяльнага рэгулявання. Калі ў сістэме сацыяльнага рэгулявання дамінуе права, мы маем справу з прававым (правацэнтрысцкім) відам сістэмы сацыяльнага рэгулявання, калі вяршэнствуе мараль – маральным (маралецэнтрысцкім), калі першынствуе палітыка – палітычным (палітыкацэнтрысцкім). Рэлігію, якая ўтварае ідэальную сацыяльна-нарматыўную сістэму [21, с. 23], на наш погляд, можна разглядаць у якасці самастойнага тыпу сацыяльнага рэгулявання побач з прававым і палітычным толькі ў тэакратычных дзяржавах, дзе рэлігія ўзвышаецца над прававым і палітычным тыпамі сацыяльнага рэгулявання і выконвае адносна іх функцыю мэтава-праграмнага элемента, забяспечвае інтэграцыю гэтых тыпаў сацыяльнага рэгулявання ў адзінае цэлае і адначасова з’яўляецца асобным рэлігійна-маральным тыпам сацыяльнага рэгулявання. У свецкіх дзяржавах існуе асобны маральна-рэлігійны тып сацыяльнага рэгулявання, які можа падпарадкоўвацца як правацэнтрысцкаму, так і палітыкацэнтрысцкаму тыпам.

Вяршэнства таго ці іншага тыпу сацыяльнага рэгулявання азначае, што яго мэтава-праграмны элемент выконвае ролю мэтава-праграмнага элемента адносна сістэмы сацыяльнага рэгулявання цалкам. Напрыклад, дамінаванне права ў сістэме сацыяльнага рэгулявання азначае, што менавіта гэты сацыяльны рэгулятар з’яўляецца *галоўным*, *агульнасацыяльным*, *інтэграцыйным рэгулятарам* [23, с. 114]. У мэтава-праграмным элеменце сістэмы сацыяльнага рэгулявання пры гэтым пераважаюць ідэі прававога характару – ідэі прававой дзяржавы, вяршэнства права і вяршэнства закону, грамадзянскай супольнасці, першынства правоў і свабод асобы і г. д. Аналагічныя працэсы назіраюцца і ў інфармацыйна-каштоўнасным элеменце сістэмы сацыяльнага рэгулявання. Напрыклад, дамінаванне рэлігійна-маральнага тыпу ў сістэме сацыяльнага рэгулявання азначае, што інфармацыя і каштоўнасці рэлігійнага і маральнага характару набываюць больш важнае значэнне, чым інфармацыя і каштоўнасці прававога і палітычнага характару.

Акрамя трох універсальных тыпаў сацыяльнага рэгулявання ў полінарматыўнай сістэме існуюць яшчэ два ўзроўні сацыяльнага рэгулявання: 1) самарэгуляванне разнастайных сацыяльных сувязяў (самаарганізацыя грамадства); 2) актыўнае ўздзеянне на паводзіны людзей з боку грамадства і яго афіцыйных прадстаўнікоў (рэгуляванне ў вузкім сэнсе слова). Узроўні сацыяльнага рэгулявання фарміруюцца на стыку сістэмы сацыяльнага рэгулявання з арганізацыйнымі структурамі грамадства, органаў і ўстаноў дзяржавы. Узроўні сацыяльнага рэгулявання існуюць у форме нарматыўна замацаваных механізмаў,

праз якія ажыццяўляюцца самаарганізацыя грамадства і актыўнае ўздзеянне на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін. Пры гэтым у дамінуючым тыпе сацыяльнага рэгулявання перавагу мае актыўнае ўздзеянне на паводзіны ўдзельнікаў грамадскіх адносін, у астатніх універсальных тыпах сацыяльнага рэгулявання можа пераважаць самаарганізацыя грамадства. Самарэгуляванне, як правіла, існуе ў невялікіх сацыяльных групах і асобных арганізацыях, дзе маюцца роднасная сацыяльная практыка, агульныя інтарэсы і агульная воля калектыву.

Першы ўзровень сацыяльнага рэгулявання характарызуецца самастойнасцю і адноснай аўтаномнасцю асобнай сацыяльнай (прафесіянальнай) групы ці арганізацыі пры вызначэнні характару і зместу рэгулявання, выбары механізмаў і сродкаў сацыяльнага рэгулявання. Для другога ўзроўню, наадварот, характэрным з’яўляецца актыўнае ўмяшальніцтва ў сацыяльныя працэсы з боку грамадзянскай супольнасці і дзяржавы, выкарыстанне стандартных механізмаў і метадаў сацыяльнага рэгулявання. Аднолькавымі для гэтых узроўняў сацыяльнага рэгулявання з’яўляюцца мэты сацыяльнага рэгулявання – самазахаванне і развіццё грамадства, але рознымі з’яўляюцца шляхі іх дасягнення.

На судакрананні і перакрыжаванні ўніверсальных тыпаў і ўзроўняў сацыяльнага рэгулявання фарміруюцца лакальныя нормы і ажыццяўляецца лакальнае рэгуляванне, а ў асобных арганізацыях (карпарацыях) – карпаратыўныя нормы і карпаратыўнае рэгуляванне. Карпаратыўнае рэгуляванне ў шырокім сэнсе слова ўключае лакальныя нормы і лакальнае рэгуляванне. Карпаратыўнае рэгуляванне найперш звязваецца з наяўнасцю карпаратыўных норм, якія складваюцца ў асобным універсальным тыпе сацыяльнага рэгулявання і ў межах асобнай сацыяльнай ці прафесіянальнай групы і асобнай арганізацыі – карпаратыўных прававых, палітычных і маральна-рэлігійных норм. Разам з тым карпаратыўнае рэгуляванне можна разглядаць у якасці «мінісацыяльнай» сістэмы сацыяльнага рэгулявання, у якой выдзяляюцца самастойныя «мініэлементы» карпаратыўнага рэгулявання. Так, кожны від карпаратыўных нарматыўных рэгулятараў мае асобныя індывідуальныя сродкі рэгулявання, у асобных сацыяльных і прафесіянальных групах выпрацоўваюцца спецыфічныя механізмы захавання і перадачы сацыяльнага вопыту – карпаратыўныя традыцыі, напрыклад дыпламатычныя рытуалы і цырымоніі, у асобных сацыяльных і прафесіянальных груп існуюць свае адметныя каштоўнасці, ствараюцца асобныя механізмы кантролю і абароны, напрыклад царкоўны суд [24, с. 384–393].

Можна выдзеліць аднароднае карпаратыўнае рэгуляванне ў межах асобнага тыпу сацыяльнага рэгулявання і комплекснае карпаратыўнае рэгуляванне, для якога характэрна выкарыстанне карпаратыўных норм, індывідуальных

сродкаў рэгулявання, традыцый і каштоўнасцей розных тыпаў сацыяльнага рэгулявання. Так, карпаратыўнае рэгуляванне дзейнасці ўрачоў заснавана на маральна-рэлігійным тыпе сацыяльнага рэгулявання, а карпаратыўнае рэгуляванне дзейнасці асоб, якія ажыццяўляюць юрыдычныя паслугі, – на комплексным выкарыстанні элементаў прававога і маральнага тыпаў сацыяльнага рэгулявання [25].

***Вывады.*** Сучасная сістэма сацыяльнага рэгулявання складаецца з разнародных элементаў. Яна сфарміравалася ў выніку працяглай эвалюцыі сацыяльнага рэгулявання, з’яўляецца арганічнай, полінарматыўнай сістэмай, у якой адначасова функцыянуюць тры ўніверсальныя тыпы сацыяльнага рэгулявання: прававы, маральна-рэлігійны і палітычны, кожны з якіх мае аднолькавы набор розных па змесце элементаў сацыяльнага рэгулявання. Адзін з тыпаў сацыяльнага рэгулявання займае дамінуючае становішча, выконвае ў сістэме сацыяльнага рэгулявання інтэграцыйную ролю і вызначае асноўныя яе характарыстыкі. У кожным з тыпаў сістэмы сацыяльнага рэгулявання выдзяляюцца два ўзроўні сацыяльнага рэгулявання: самарэгуляванне (самаарганізацыя грамадства) і актыўнае ўздзеянне на паводзіны людзей з боку грамадства і дзяржавы. На перасячэнні ўніверсальных тыпаў і двух узроўняў сацыяльнага рэгулявання фарміруецца карпаратыўнае рэгуляванне.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Нерсесянц В. С.* Право в системе социальной регуляции. М. : Знание, 1986.

2. *Матузов Н. И.* Право в системе социальных норм // Правоведение. 1996. № 2. С. 144–157.

3. *Бибило В. Н.* Судебная власть в уголовном судопроизводстве. Минск : Право и экономика, 2001.

4. *Хропанюк В. Н.* Теория государства и права : учеб. пособие для высш. учеб. заведений / под ред. В. Г. Стрекозова. М., 2000.

5. *Бошно С. В.* Теория государства и права : учебник. 2-е изд., перераб. и доп. М. : Эксмо, 2011.

6. Теория государства и права : курс лекций / под ред. Н. И. Матузова и А. В. Малько. М. : Юристъ, 1997.

7. *Червонюк В. И.* Теория государства и права : учебник. М. : ИНФРА-М, 2006.

8. Теория государства и права : учеб. пособие / под ред. Е. И. Темнова. М. : КНОРУС, 2007.

9. Теория государства и права : учеб. для вузов / под общ. ред. О. В. Мартышина. М. : Норма, 2007.

10. *Морозова Л. А.* Теория государства и права : учебник. 2-е изд., перераб., доп. М. : Эксмо, 2007.

11. *Венгеров А. Б.* Теория государства и права : учеб. для юрид. вузов. 6-е изд., стер. М. : Омега-Л, 2009.

12. *Дробязко С. Г., Козлов В. С.* Общая теория права : учеб. пособие для вузов. 2-е изд., испр. и доп. Минск : Амалфея, 2007.

13. *Головастикова А. Н., Дмитриев Ю. А.* Проблемы теории государства и права : учебник. М. : Эксмо, 2005.

14. Теория государства и права : учеб. для юрид. вузов и фак-тов / под ред.: В. М. Корельского, В. Д. Перевалова. М. : ИНФРА-М : Норма, 1997.

15. Системный подход и принципы деятельности / редкол.: И. В. Блауберг [и др.] ; сост.: А. П. Огурцов, Б. Г. Юдин. М. : Наука, 1978.

16. *Вернадский В. И.* Начало и вечность жизни / сост., вступ. ст., коммент.: М. С. Бастраковой, И. И. Мочалова, В. С. Неаполитанской. М. : Совет. Россия, 1989.

17. *Турчин В. Ф.* Феномен науки: кибернетический подход к эволюции. 2-е изд. М. : ЭТС, 2000.

18. *Пьер Тейяр де Шарден.* Феномен человека / предисл. и коммент. Б. А. Старостина ; пер. с фр. Н. А. Садовского. М. : Наука, 1987.

19. *Вейник В. И.* Почему я верю в Бога. Исследование проявлений духовного мира. 4-е изд. Минск : Изд-во Белорус. Экзархата, 2004.

20. Философский энциклопедический словарь / редкол.: Л. Ф. Ильичев (гл. ред.) [и др.]. М. : Совет. энцикл., 1983.

21. *Мурашко Л. О.* Поиск права. Минск : Веды, 2004.

22. *Сильченко Н. В.* Зарождение первичных закономерностей нормативного регулирования общественных отношений // Государство и право: теория и практика : межвуз. сб. науч. тр. / отв. ред. В. П. Прокопьев. Калининград : Изд-во КГУ, 2004. Вып. 3. С. 22–35.

23. *Дробязко С. Г.* Современное правопонимание и его акценты // Степан Григорьевич Дробязко: к 90-летию со дня рождения С. Г. Дробязко / редкол.: С. А. Балашенко [и др.]. Минск : Бизнесофсет, 2013. С. 110–114.

24. *Цыпин В. А.*, прот. Церковное право : учеб. пособие. М., 1994.

25. Об утверждении Правил профессиональной этики лиц, осуществляющих деятельность по оказанию юридических услуг : постановление М-ва юстиции Респ. Беларусь, 19 апр. 2000 г., № 6 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. 2000. № 48. 8/3401.

*Статья поступила в редакцию 08.06.2015*